УДК 811.161.3'276.6

# ФАРМІРАВАВАННЕ МАЎЛЕНЧАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ МАСТАЦКІХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЎРЫСТЫЧНЫХ ЗАДАННЯЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА. ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА»

**Г. У. Крофта**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Захарава, 32, 220003, г. Гродна, Беларусь, hanna_krofta@mail.ru*

Артыкул прысвечаны праблеме фарміравання маўленчай кампетэнцыі студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцей пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка». Маўленчая кампетэнцыя з’яўляецца другой пасля кампетэнцыі моўнай (лінгвістычнай) часткай у структуры камунікатыўнай кампетэнцыі. Яна прадугледжвае выкарыстанне мовы ў якасці сродку фармулявання і выражэння думак. Каб падрыхтаваць спецыяліста, які эфектыўна карыстаецца сродкамі беларускай мовы ў розных сітуацыях прафесійных зносін, пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» мэтазгодна выкарыстоўваць заданні, накіраваныя на пабудову студэнтамі уласных маналагічных ці дыялагічных выказванняў. Эўрыстычныя заданні прадугледжваюць стварэнне навучэнцамі асабістага адукацыйнага прадукту. У артыкуле прыводзяцца прыклады заданняў такога тыпу, якія могуць прымяняцца пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка».

***Ключавыя словы:*** прафесійная лексіка; маўленчая кампетэнцыя; эўрыстычныя заданні.

# FORMATION OF SPEAKING COMPETENCE OF ART STUDENTS THROUGH THE USE OF HEURISTIC TASKS IN THE DISCIPLINE «BELARUSIAN LANGUAGE. PROFESSIONAL VOCABULARY»

**H. U. Krofta**

*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*Zakharova St., 32, 220003, Grodno, Belarus, hanna_krofta@mail.ru*

The article is devoted to the problem of formation of speech competence of students of art majors when studying the discipline «Belarusian language. Professional vocabulary». Speech competence is one of the components in the structure of communicative competence, the next after language (linguistic) competence. It involves the use of language as a means of formulating and expressing thoughts. To train a specialist who effectively uses the tools of the Belarusian language in various situations of professional communication, when studying the discipline «Belarusian language. Professional vocabulary» it is appropriate to use tasks aimed at creating students' own monological or

dialogic statements. Heuristic tasks involve the creation of a personal educational product by students. The article gives examples of tasks of this type that can be used in teaching the discipline «Belarusian language. Professional vocabulary».

***Key words:*** professional vocabulary; speech competence; heuristic tasks.

Маўленчая кампетэнцыя абазначае «валоданне спосабамі фарміравання і фармулявання думак сродкамі мовы і ўменне карыстацца такімі сродкамі ў працэсе ўспрымання і спараджэння маўлення» [1, с. 251]. Гэта наступная «прыступка» ў структуры камунікатыўнай кампетэнцыі пасля кампетэнцыі моўнай (лінгвістычнай), якая, у сваю чаргу, прадугледжвае валоданне ведамі аб мове як іерархічна арганізаванай сістэме і ўменне карыстацца гэтай сістэмай на практыцы, ужываючы граматычна правільныя канструкцыі [1, с. 362].

Праблема фарміравання маўленчай кампетэнцыі студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей падчас вывучэння дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» з’яўляецца актуальнай. Ва ўмовах незбалансаванага блізкароднаснага білінгвізму падрыхтоўка спецыяліста, які валодае навыкамі рацыянальных і эфектыўных маўленчых паводзін у разнастайных сітуацыях прафесійнага і дзелавога суразмоўніцтва патрабуе, у першую чаргу, вывучэння беларускай мовы як сістэмы, засваення яе нормаў. Па-другое, маўленне ў прафесійнай сферы зносін прадугледжвае веданне беларускамоўнай тэрміналогіі, спосабаў перакладу навуковых тэкстаў, разуменне асаблівасцей функцыянальных стыляў, засваенне правіл маўленчага этыкету.

Разам з тым, каб беларуская мова стала натуральным сродкам фармулявання думак, патрэбна пастаянная практыка ў пабудове беларускамоўных выказванняў. Патрэба ў такіх выказваннях узнікае, напрыклад, пры выкананні эўрыстычных заданняў падчас вывучэння дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка».

Эўрыстычныя заданні – гэта заданні адкрытага тыпу, якія прадугледжваюць «стварэнне вучнем асабістага адукацыйнага прадукту з выкарыстаннем эўрыстычных спосабаў і форм дзейнасці» [2]. Прыкметамі эўрыстычнага задання А. В. Хутарскі лічыць адкрытасць, апору на творчы патэнцыял навучэнца, наяўнасць у заданні актуальнай для вырашэння праблемы [2].

Адно з заданняў, якое можа быць прапанавана студэнтам у межах вывучэння дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» – падрыхтоўка прэзентацыі «Мая будучая прафесія»: неабходна стварыць мультымедыйную ці відэапрэзентацыю (абавязкова з тэкставым суправаджэннем), у якой раскрывалася б сутнасць будучай прафесійнай дзейнасці, а таксама асаблівасці адукацыйнага працэсу пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Трэба адзначыць, што прэзентацыі, створаныя студэнтамі, перадавалі іх асабістае бачанне сябе ў прафесіі і адрозніваліся

арыгінальнасцю, нестандартнымі формамі падачы матэрыялу. Пасля дэманстрацыі выкананых заданняў арганізоўвалася абмеркаванне.

Раскрыццю творчага патэнцыялу студэнтаў спрыяла выкананне індывідуальнага задання «Майстар-клас», паводле ўмоў якога трэба было ўявіць сябе блогерам, які дзеліцца сваім мастэрствам у сацыяльных сетках, і падрыхтаваць тэматычны відэаролік. Групе прапаноўвалася відэаролік пракаментаваць.

У межах вывучэння тэмы «Беларуская навуковая тэрміналогія» выконвалася заданне «Мой прафесійны слоўнік». Неабходна было выбраць тэрміны пэўнай тэматычнай групы (напрыклад, «Паверхні для малявання (на чым мы малюем?)», «Фарбы, пігменты і іх уласцівасці», «Тэрміналогія відэамантажу», «Паліграфічныя тэрміны», «Назвы вопраткі і яе элементаў», «Тканіны і іх уласцівасці» і інш.), раскрыць іх значэнне і этымалогію, праілюстраваць. Натуральна, ствараўся не сапраўдны слоўнік, а невялікі ілюстраваны даведнік, які можа быць карысным пры вывучэнні прафесійнай беларускамоўнай тэрміналогіі. Актуальнасць стварэння такіх даведнікаў абумоўлена адсутнасцю спецыялізаваных слоўнікаў прафесійнай лексікі сферы мастацтва і пастаянным папаўненнем тэрмінасістэмы за кошт узнікнення новых напрамкаў мастацкай дзейнасці.

Пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» можна праводзіць заняткі камунікатыўнага тыпу. На думку А. Д. Караля, камунікатыўны тып урока дапамагае «разгаварыць» навучэнцаў, «арыентаваць на вывучэнне тэмы і ў той жа час развіваць навыкі працы ў групах, уменне слухаць іншага чалавека, уменне бачыць сябе вачыма іншых людзей» [3, с. 19].

Падчас такіх заняткаў студэнты будуюць выказванні на беларускай мове ў розных функцыянальных стылях.

Напрыклад, пры вывучэнні раздзела «Публіцыстычны стыль» магчыма арганізаваць дыспут. Дыспут праводзіцца ў падгрупах па 4–5 чалавек, дзе вызначаюцца наступныя ролі:

1) «Вядучы»: арганізуе гутарку, задае пытанні, дае слова, спыняе спрэчкі;

2) «Абаронца»: шукае станоўчыя бакі ў з’яве, прыводзіць доказы на іх карысць;

3) «Крытык»: шукае адмоўныя бакі ў з’яве, прыводзіць доказы, аргументы;

4) «Гледачы»: задаюць правакацыйныя пытанні, згаджаюцца ці не згаджаюцца з аргументамі «Абаронцы» і «Крытыка».

Пытанні, вакол якіх вядзецца дыспут, выбіраюцца ў адпаведнасці з інтарэсамі студэнтаў, з іх бачаннем праблем, якія існуюць у сучасным мастацтве. Напрыклад: «Асоба мастака (дызайнера) у сучасным грамадстве»; «Дзіджытал vs традыцыйнае мастацтва», «Мастацтва, якое трапіла

ў сацыяльныя сеткі», «Прастора творчасці ў эпоху постмадэрну», «Перформансы як феномен сучаснага мастацтва», «Цёмны і светлы бок NFT», «Будучыня за нейрасеткай?» і інш.

Студэнты папярэдне знаёмяцца з правіламі правядзення дыспуту, з асаблівасцямі дыспуту як аднаго з вусных жанраў публіцыстычнага стылю, з прынцыпамі адбору маўленчых сродкаў, якія ўзмацняюць уздзеянне тэксту на слухачоў. Удзельнікамі дыспуту загадзя падрыхтоўваецца пералік аргументаў, нагляднасць, а таксама – пры неабходнасці – спіс тых слоў і выразаў, якія будуць выкарыстаны ў маўленні.

Занятак камунікатыўнага тыпу праводзіўся ў фармаце навуковай канферэнцыі пры вывучэнні тэмы «Навуковы стыль». Аднак, улічваючы спецыфіку мастацкіх спецыяльнасцей і тое, што ў межах вывучэння дысцыпліны немагчыма падрыхтаваць паўнавартасны навуковы даклад, было прапанавана зрабіць міні-выступленні ў фармаце «10 цікавых фактаў пра…» (у навукова-публіцыстычным стылі). Тэматыку выступлення студэнты выбіралі самастойна ў межах зададзенага напрамку: яна павінна мець дачыненне да сферы будучай прафесійнай дзейнасці альбо да беларускай культуры, мовы, літаратуры. Пасля чытання дакладаў аўдыторыя задавала пытанні. Правядзенне такой міні-канферэнцыі спрыяла ўсведамленню студэнтамі асаблівасцей навуковага дыскурсу.

Такім чынам, заданні адкрытага тыпу, у прыватнасці, эўрыстычныя заданні, дапаўняюць такія традыцыйныя формы работы пры вывучэнні прафесійнай лексікі беларускай мовы, як выкананне практыкаванняў па лексіцы і граматыцы, аналіз і стварэнне тэкстаў розных функцыянальных стыляў, пераклад навуковых тэкстаў. Пры выкананні эўрыстычных заданняў ствараюцца ўмовы для авалодання беларускай мовай на практычным узроўні; у студэнтаў узнікае патрэба ў фарміраванні і выражэнні думак на беларускай мове, у пабудове маналагічных і дыялагічных выказванняў на прафесійную тэму.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Азимов Э. Г., Щукин А. Н.* Новый словарь методических терминов и понятий (теория и практика обучения языкам). М. :Изд-во ИКАР, 2009.

2. *Хуторской А. В.* Эвристическое задание [Электронный ресурс]. URL: http://khutorskoy.ru/science/concepts/terms/heuristic_task.htm (дата обращения: 10.03.2023).

3. *Король А. Д.* Как разработать и провести занятие эвристического типа. Разработки участников оргдеятельностного семинара, анализ, рефлексия : практикум. Гродно : ГрГУ, 2017.